Узбекскія пісьменнікі — госці Міністэрства інфармацыі

У апошні час шырокі прасцяг атрымліваюць беларуска-ўзбекскія медыйныя, літаратурныя, выдавецкія сувязі.

Адзін з прыкладаў — гасцяванне ў Беларусі старшыні Саюза пісьменнікаў Узбекістана народнага паэта Узбекістана Сіражыддзіна Саідава, а таксама кіраўніка фонду «Іжод» пры Саюзе пісьменнікаў Узбекістана Шэрзада Ізроева. Днямі сустрэчу з імі правёў міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч. Пасля сустрэчы ўдалося пагутарыць з кіраўніком пісьменніцкай арганізацыі.

— Мяне ўразіла Беларусь, мяне ўразілі беларусы, — сказаў спадар Сіражыддзін Саідаў. — Я ўпершыню гасцюю ў вашай краіне. Але паверце, дзякуючы вам, у мяне атрымалася канструктыўнае гасцяванне. У хуткім часе ў Ташкент з афіцыйным візітам наведаецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Мы вельмі рады гэтаму. І спадзяёмся на новае развіццё беларуска-ўзбекскіх адносін. У самых розных галінах жыццядзейнасці. Да візіту кіраўніка вашай краіны прымеркавана ўрачыстае адкрыццё бюста народнага песняра Беларусі Якуба Коласа ў Ташкенце. Перад ад'ездам у Беларусь мне пазванілі з друкарні і сказалі, што днямі будзе гатовы сігнал ды і ўвесь тыраж кнігі паэзіі Якуба Коласа на ўзбекскай мове. У нас ізноў з'явілася вуліца з імем Коласа, які ў час Вялікай Айчыннай жыў у сталіцы Узбекістана. Апошнімі днямі — у жніўні — узбекскія газеты надрукавалі некалькі матэрыялаў пра літаратурныя сувязі нашых краін. Ведаю, што ў вас выйшаў адмысловы «ўзбекскі выпуск» часопіса «Беларусь» на трох мовах: рускай, беларускай, кітайскай. Мы распрацавалі пры Саюзе пісьменнікаў Узбекістана праграму па прадстаўленні іншых нацыянальных літаратур на ўзбекскай мове. І за Беларуссю, беларускай літаратурай — несумненныя прыярытэты. У блізкай перспектыве мы збіраемся выдаць па-ўзбекску анталогію сучаснай беларускай паэзіі. Ёсць дамоўленасць пра выданне анталогіі сучаснай узбекскай паэзіі і ў Мінску — у перакладзе на беларускую мову. Ведаю, што на пачатку 1990-х выходзіла ў Мінску кніга лірыкі Алішэра Наваі. Але гэта такі паэт, што для яго прадстаўлення мала і дзясяткаў кніг. Так што чакаем, што сённяшняе пакаленне беларускіх перакладчыкаў возьмецца за перастварэнне паэзіі Алішэра Наваі на беларускую мову.

— Спадар Сіражыддзін, вось раней традыцыяй былі Дні нацыянальных літаратур...

— І я памятаю пра іх. Такія дні, дэкады дазвалялі пашыраць знаёмствы. Мяркую, што ў нас ёсць усе падставы правесці Дні беларускай літаратуры ва Узбекістане. Чаму б не арганізаваць і беларуска-ўзбекскі пісьменніцкі форум?! Гэта спрыяла б шырэйшай увазе да нашых нацыянальных культур і літаратур.

Застаецца дадаць, што спасцігнуць чужы свет, чужую культуру можна найперш праз слова і кнігу. Ідучы па гэтым шляху, пісьменнікі нашых краін — Узбекістана і Беларусі — шмат што здольны зрабіць.

Мікола БЕРЛЕЖ.

НАБЕГАЛІ НА 165 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ

Каб дапамагчы дзецям, беларусы прабеглі больш за 30 тысяч кіламетраў

У дабрачынным марафоне «Бягучыя гарады» ўзялі ўдзел больш за 5 тысяч беларусаў, якія прабеглі 30 тысяч кіламетраў, сабраўшы тым самым рэкордную суму — 165 тысяч рублёў. Сродкі пералічаны шасці дзіцячым рэабілітацыйным цэнтрам.

Рэспубліканская дабрачынная акцыя праходзіла ў межах праекта #velcombegom з 23 ліпеня па 2 верасня пры падтрымцы Міністэрства аховы здароўя і ахапіла ўсе вобласці. Дыстанцыі, якія пераадолелі ўдзельнікі, пайшлі ў залік пэўнаму рэгіёну. Кампанія velcom, арганізатар акцыі, падлічыла кіламетры, перавяла іх у грошы і пералічыла сродкі рэабілітацыйным цэнтрам. У выніку пераможцай стала Гродзенская вобласць — яе ўдзельнікі сумарна пераадолелі больш за 7 тысяч кіламетраў. На другім месцы — Гомельская вобласць з вынікам 5960 кіламетраў, трэцяе месца ў Брэсцкай вобласці — 5040. Астатнія месцы раздзялілі паміж сабой Магілёўскі рэгіён — 4927 кіламетраў, Віцебскі — 4823 кіламетры і Мінскі — 4157 кіламетраў.

Удзельнікі акцыі ставілі і асабістыя рэкорды. Самы доўгі забег на рахунку Пятра Рагойшы з Брэсцкай вобласці: за 12 гадзін ён пераадолеў 108 кіламетраў. Жыхарка Бабруйска Вольга Няжэльская за 12 гадзін прабегла 89,3 кіламетра. А самы масавы забег адбыўся ў Гомелі — 25 ліпеня на старт у абласным цэнтры выйшлі каля тысячы ўдзельнікаў. Падтрымалі акцыю і знакамітыя спартсмены. Біятланістка Надзея Скардзіна, напрыклад, падарыла свае кіламетры сталічнаму рэгіёну. Яму ж дадала 134 кіламетры і Дырэкцыя Еўрапейскіх гульняў.

Такім чынам, 40 тысяч рублёў атрымаў Гродзенскі абласны цэнтр медыцынскай рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў і хворых дзяцей псіханеўралагічнага профілю. Гомельскаму абласному дзіцячаму цэнтру медыцынскай рэабілітацыі «Верасок» пералічана 35 тысяч рублёў, а 30 тысяч рублёў накіравана Брэсцкаму абласному цэнтру «Тамашоўка». Магілёўскі дзіцячы цэнтр медыцынскай рэабілітацыі «Космас» атрымаў 25 тысяч рублёў, 20 тысяч рублёў — абласны дзіцячы рэабілітацыйны аздараўленчы цэнтр «Ветразь» (Віцебская вобласць), 15 тысяч рублёў — дзіцячы рэабілітацыйны цэнтр «Пухавічы» (Мінская вобласць).

— Як паказала наша акцыя, у Беларусі шмат нераўнадушных людзей. Дабрачынны праект праходзіць чатыры гады, і кожны раз нашу ініцыятыву падтрымліваюць тысячы беларусаў, — адзначыў **першы намеснік генеральнага дырэктара кампаніі velcom Мікалай ЮШКЕВІЧ.** Арганізатары паабяцалі, што ў праекта абавязкова будзе пяты сезон, які стане не менш запамінальным і карысным, чым папярэднія.

Алена КРАВЕЦ.

ДА ПАРЫ ЗБАН ВАДУ НОСІЦЬ...

У Гомелі завершана справа аб хабары ў 70 тысяч долараў

Як паведаміла афіцыйны прадстаўнік УСК па Гомельскай вобласці Марыя Крыванога, перад судом па справе 2008 года паўстане апошні абвінавачваны, які знаходзіўся ў міжнародным вышуку.

Па даных следства, антыкрызісны кіраўнік збанкручанага ТАА «Белаграпрад» уступіў у злачынную змову з заснавальнікам ТДА «Цэнтр нерухомасці» і яшчэ адным жыхаром горада Гомеля для таго, каб за хабар аказаць садзейнічанне дырэктару ТАА «Аўтаінвестканітал» у набыцці ў абласным цэнтры будынка крамы ТАА «Белаграпрад».

Два зламыснікі павінны былі атрымаць ад дырэктара ТАА «Аўтаінвестканітал» у якасці хабару для антыкрызіснага кіраўніка грашовыя сродкі ў суме 70 тысяч долараў. Аднак саўдзельнікі кіраўніка ў мэтах асабістага ўзбагачэння шляхам падману завысілі суму хабару на 30 тысяч долараў, пераканаўшы дырэктара перадаць увогуле 100 тысяч долараў.

Згодна са злачынным планам, антыкрызісны кіраўнік забяспечыў на аўкцыёне, праведзеным з парушэннем устаноўленага парадку, набыццё дырэктарам ТАА «Аўтаінвестканітал» аб'екта нерухомасці, які цікавіў яго, па выгаднай цане. Перададзеныя дырэктарам у якасці хабару грошы ўдзельнікі злачынства падзялілі паміж сабой, пры гэтым кіраўнік атрымаў толькі 10 тысяч долараў.

Заснавальнік ТДА «Цэнтр нерухомасці», антыкрызісны кіраўнік і хабарадавальнік — дырэктар ТАА «Аўтаінвестканітал» былі прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці яшчэ ў 2009 годзе. Чацвёртаму фігуранту ўдалося збегчы.

Па інфармацыі аператыўнікаў, «уцякач» меў крымінальныя сувязі як у Беларусі, так і за яе межамі. Таксама ён мог мець дачыненне не менш чым да дзвюх злачынных груп, якія дзейнічалі на тэрыторыі Гомельскай вобласці ў 2000-х гадах.

Абвінавачваны хаваўся ў Прыморскім краі Расійскай Федэрацыі, дзе займаўся прадпрымальніцкай дзейнасцю. Мужчына быў затрыманы праваахоўнымі органамі суседняй дзяржавы і этапіраваны ў Беларусь.

Следчае ўпраўленне УСК па Гомельскай вобласці кваліфікавала дзеянні абвінавачванага па ч. 6 арт. 16, ч. 3 арт. 430 (дапамога ў атрыманні хабару групай асоб па папярэдняй змове ў асабліва буйным памеры), ч. 4 арт. 209 (махлярства, учыненае групай асоб у асабліва буйным памеры) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Крымінальная справа перададзена ў пракуратуру для накіравання ў суд.

Сяргей КУЛАКОЎ.

УСЁ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА

У маладых навукоўцаў з'явіўся свой талісман

Новая скульптурная кампазіцыя «Пераемнасць беларускай навукі» з'явілася ў Мінску перад будынкам Прэзідыума НАН Беларусі: вопытны акадэмік запрашае ў Акадэмію навук маладога калегу. Яе адкрыццё адбылося ў рамках урачыстасцяў, прысвечаных пачатку новага навучальнага года ў Інстытуце падрыхтоўкі навуковых кадраў Акадэміі навук.

«Мы спецыяльна прымеркавалі гэту падзею да Дня ведаў, бо хацелі адкрыць мастацкую кампазіцыю менавіта з вашым удзелам, — падкрэсліў, звяртаючыся да новых магістрантаў, **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Мы лічым, што ў захаванні пераемнасці і заключаецца вялікі сэнс навукі».

Уладзімір Гусакоў заклікаў магістрантаў актыўна ўключацца ў жыццё навуковых арганізацый: «Моладзі сёння адводзіцца асаблівая роля. Работа даследчыкаў-пачаткоўцаў — гэта не толькі ўдзел у правядзенні прыярытэтных навуковых распрацовак, але і ўдасканаленне асобасных кампетэнцый, якія дазволяць маладому навукоўцу актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні найбольш актуальных праблем навукі і грамадства».

Аўтары манументальна-дэкаратыўнай кампазіцыі — скульптары Алена Хараберуш, Леанард Пакульніцкі і архітэктар Армен Сардараў. Скульптурная кампазіцыя не толькі выконвае дэкаратыўную функцыю, але і мае значны сэнс. Рэалізаваны ў бронзе праект, прысвечаны 90-годдзю НАН Беларусі, стане важнай мастацкай дамінантай у агульнай кампазіцыі зоны перад будынкам Прэзідыума НАН Беларусі, падкрэсліць асноўную задуму гістарычнага архітэктурнага збудавання і яго стыль.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Больш за 2/3 французаў не падтрымліваюць дзейнасць Макрона на пасадзе прэзідэнта

Папулярнасць прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона знаходзіцца на самым нізкім узроўні з моманту яго ўступлення на пасаду (май 2017 года), яна знізілася за месяц на дзесяць працэнтных пунктаў — да 31 %. Пра гэта сведчаць апублікаваныя ў аўторак вынікі апытання грамадскай думкі, праведзенага службай Ifop.

Папулярнасць Макрона апынулася нават ніжэй, чым у яго папярэдніка на прэзідэнцкай пасадзе Франсуа Аланда пасля такога ж перыяду — 1,4 года — знаходжання ва ўладзе (восенню 2013 года таго падтрымлівалі 32 % выбаршчыкаў).

Пры гэтым, па даных апытання, толькі 32 % французаў лічаць, што Макрон «праводзіць правільную эканамічную палітыку», у той час як супрацьлеглага меркавання прытрымліваюцца 68 % апытаных. У тым, што ў сваёй дзейнасці прэзідэнт «блізкі да чаканняў французаў», упэўненыя толькі 22 % рэспандэнтаў.

У Венесуэле назвалі заявы аб гуманітарным крызісе апраўданнем для ўварвання ў краіну

Выканаўчы віцэ-прэзідэнт Венесуэлы Дэльсі Радрыгес ахарактарызавала заявы аб тым, што Венесуэла перажывае гуманітарны крызіс, як спробу апраўдаць магчымае знешняе ўварванне ў краіну. З такой заявай палітык выступіла, падкрэсліўшы, што сцвярджэнні аб сітуацыі ў краіне не адпавядаюць рэчаіснасці.

«Большасць тых, хто перасякае мяжу паміж Венесуэлай і Калумбіяй па мосце, з'яўляюцца калумбійцамі. 52 % прыходзяць па пакупкі, і толькі 33 % з'яўляюцца венесуэльцамі», — цытуе Радрыгес на сваім сайце тэлеканал Globovision. Па словах віцэ-прэзідэнта, розныя сілы спрабуюць паказаць сітуацыю вакол «нармальных міграцыйных патокаў» як гуманітарны крызіс. «Усё гэта заклікана апраўдаць уварванне на нацыянальную тэрыторыю», — адзначыла Радрыгес. Яна дадала, што ўлады Венесуэлы не дапусцяць такога развіцця падзей.

У апошнія гады Венесуэла перажывае востры сацыяльна-эканамічны крызіс, які суправаджаецца гіперінфляцыяй, дэвальвацыяй нацыянальнай валюты і дэфіцытам тавараў першай неабходнасці і лекаў. Цяжкая сітуацыя змушае многіх венесуэльцаў пакідаць радзіму. Паводле апошніх даных ААН, з Баліварыянскай Рэспублікі з'ехалі каля 2,3 млн чалавек, у асноўным у Калумбію, Эквадор, Перу і Бразілію.

«Страх»: у ЗША выйдзе новая кніга пра Дональда Трампа

75-гадовы Боб Вудвард, журналіст і рэдактар газеты The Washington Post, які разам з Карлам Бернштэйнам стаў знакаміты дзякуючы асвятленню Уотэргейцкага скандалу, публікуе кнігу пра Дональда Трампа. Яна выйдзе 11 верасня, і да гэтага часу ў прэсу не прасачылася ніводнага радка з гэтай загадкавай кнігі.

Усё пачалося з інтэрв'ю, якое Вудвард браў у Трампа ў красавіку 2016 года, калі нью-ёркскі мільярдэр яшчэ быў звычайным кандыдатам на праймерыз ад Рэспубліканскай партыі. Журналіст, як заўсёды, старанна падрыхтаваў пытанні, адно з якіх датычылася самага балючага для Трампа моманту — адносін да дзейнага тады прэзідэнта Барака Абамы. «Ці згодныя вы са сцверджаннем Абамы пра тое, што сапраўдная ўлада азначае дасягненне мэты без выкарыстання гвалту?» — спытаў журналіст. Трамп, заікаючыся, адказаў: «Я думаю, што ў гэтым ёсць пэўная праўда. Сапраўдная ўлада — гэта павага». А потым, пасля паўзы, дадаў: «Сапраўдная ўлада — гэта... я нават не маю права вымавіць... гэта страх».

Кніга Боба Вудварда пра Трампа так і называецца — «Страх». Вядома, што яна апісвае жыццё прэзідэнта ў Белым доме, над якім з моманту інаўгурацыі навіс цень імпічменту. Чакаецца, што выхад кнігі створыць эфект узарванай бомбы, піша газета Le Figaro.